Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| Д.В. Герасімёнак | Ю.М. Галкоўская |
| «19» 12 2023 г. | «19» 12 2023 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
**ГІСТОРЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЯ ТУРЫЗМУ**
*для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

Складальнік:
Герасімёнак Д.В., загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

Разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні
Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый
«19» 12 2023 г., пратакол № 4

Мінск 2023

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і менеджменту* прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава»;

*С.А. Пацыенка*, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

# ЗМЕСТ

1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 6

2.1 План-канспект лекцый 6

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 12

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 12

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 15

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 15

4.2 Пытанні для экзамена 16

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 19

5.1 Тэматычны план 19

5.2 Асноўная літаратура 22

5.3 Дадатковая літаратура 23

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Актуальнасць* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» абумоўлена важнасцю разумення гістарычнага развіцця і сучаснага стану турыстычнай дзейнасці. Этапы станаўлення турызму акрэсліваюць нацыянальныя асаблівасці развіцця турыстычнага патэнцыялу краіны. Сістэма арганізацыі турыстычнай індустрыі мае сваю спецыфіку і ўключае тураператарскую і турагенцкую дзейнасць. Склад прадастаўляемых паслуг турыстычных арганізацый уключае транспарціроўку, размяшчэнне, забеспячэнне харчаваннем, экскурсійнымі паслугамі і іншыя патрэбы людзей падчас падарожжа.

Асноўныя *мэты* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» – фарміраванне ў студэнтаў тэарытычных і практычных ведаў ў турыстычнай дзейнасці з улікам прыярытэту развіцця нацыянальнага турызму Рэспублікі Беларусь.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» – даць студэнтам сістэмныя веды аб этапах і заканамернасцях развіцця турыстычнай дзейнасці; раскрыць спецыфіку прафесійнай дзейнасці ў турыстычнай сферы; выпрацаваць неабходныя практычныя навыкі па апрацоўцы інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках).

Патрабаванні да базавых прафесійных кампетэнцый спецыяліста:

БПК-3. Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, вылучаць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгіёнаў.

Патрабаванні да спецыялізаваных кампетэнцый спецыяліста:

СК-11. Выяўляць і ацэньваць асноўныя тэндэнцыі развіцця навуковых ведау і сфер іх прыкладання, аналізаваць ключавыя эканамічныя працэсы і іх уплыў на развіццё краін на розных гістарычных этапах.

СК-12. Ствараць інавацыйныя культурныя праекты, укараняць і ацэньваць іх вынікі, распрацоўваць і выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай індустрыі.

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» ўлічваецца яе сувязь з вучэбнымі дысцыплінамі: «Тэорыя турызму», «Гістарычнае краязнаўства», «Уводзіны ў спецыяльнасць», «Геаграфія турызму» і іншымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» прадугледжана 202 гадзіны, з якіх 98 – аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах: лекцыі – 58 гадзін, семінарскія заняткі – 40 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік (у 5 семестры) і экзамен (у 6 семестры).

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### Тэма 1. Уводзіны. Прадмет і змест курса

Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі і арганізацыі турыстычнай дзейнасці. Задачы, структура і змест курса. Формы кантролю. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Відэаматэрыялы і дакументальныя фільмы па гісторыі падарожжаў і развіццё турызму у свеце. Агульная характарыстыка крыніц і літаратуры.

## РАЗДЗЕЛ 1. ГІСТОРЫЯ ПАДАРОЖЖАЎ І ТУРЫЗМУ

### Тэма 2. Перыядызацыя гісторыі турызму

Асноўныя паняцці гісторыі турызму: «падарожжа», «турызм», «гасціннасць». Аб’ект і прадмет гісторыі турызму. Гістарыяграфія турызму. Падыходы да вызначэння перыядызацыі гісторыі турызму.

### Тэма 3. Гісторыя падарожжаў у Старажытным свеце

Матывацыя міграцый першабытных людзей. Развіццё водных і сухапутных транспартных сродкаў. Падарожжы старажытных егіпцян. Сістэма гасціннасці ў Старажытным свеце. Матывацыя падарожжаў у старажытным Кітаі і іншых усходніх дзяржавах.

Развіццё падарожжаў у эпоху Антычнасці. Матывы і маршруты падарожжаў. Транспартныя сродкі ў старажытнай Грэцыі і Рыме. Падарожжы на марскіх судах. Сухапутныя перамяшчэнні. Сістэма гасціннасці ў старажытнай Грэцыі і Рыме.

### Тэма 4. Падарожжы ў эпоху Сярэднявечча

Развіццё транспартных сродкаў і шляхоў. Сістэма гасціннасці: заязныя

двары, корчмы, шпіталі. Роля манастыроў у развіцці падарожжаў. Паломніцтва як вядучы від падарожжаў у Сярэднявеччы. Папулярныя паломніцкія цэнтры Заходняй Еўропы. Роля крыжовых паходаў у развіцці падарожжаў. Матывацыя і напрамкі падарожжаў. Роля гандлю і ваенных паходаў у пашырэнні геаграфіі падарожжаў.

**Тэма 5. Вандраванні у эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў**

Роля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў у пашырэнні геаграфіі падарожжаў. Напрамкі падарожжаў і матывацыя кругасветных падарожжаў. Вялікія вандроўнікі: А. Веспучы, Х. Калумб, Ф. Магелан, В. да Гама, Дж. Кук і інш. Развіццё транспарту і транспартных шляхоў. З'яўленне каравелы і яе роля у развіцці марскога транспарту. Даследчыя мэты падарожжаў. Роля эпохі ў адкрыцці новых турыстычных шляхоў.

**Тэма 6. Падарожжы ў XVIII–XIX стст.**

Развіццё шляхоў зносін і транспарту. З'яўленне дыліжанса і арганізаваных перавозак пасажыраў. Мэта падарожжа як форма баўлення вольнага часу. Асноўныя напрамкі падарожжаў у эпоху Новага часу. «Грандтур» як характэрная асаблівасць падарожжаў Новага часу. Пашырэнне геаграфіі падарожжаў. Саслоўна-элітарны і забаўляльны характар падарожжаў.

**Тэма 7. Турыстычная індустрыя ў XX–XXI стст.**

Турызм як масавая з'ява. Развіццё аўтамабільнага і авіятранспарту і яго ўплыў на якасць і хуткасць падарожжаў. Спорт і турызм у СССР. Уплыў сусветных войнаў на развіццё турызму. Пасляваенныя тэндэнцыі ў развіцці турызму. З'яўленне канцэпцыі сацыяльнага турызму. Развіццё новых напрамкаў у турыстычнай дзейнасці. Міжнародны турызм. Сучасныя тэндэнцыі развіцця турызму і гасціннасці.

**Тэма 8. Гісторыя падарожжаў Беларусі**

Матывацыя і геаграфія першых падарожжаў. Падарожжы з рэлігійнымі мэтамі. Мода на падарожжа сярод магнатаў Рэчы Паспалітай. Падарожжы з лячэбнымі мэтамі ў Беларусі. Традыцыі гасціннасці на тэрыторыі Беларусі. Роля краязнаўчага руху XIX–XX стст. у развіцці падарожжаў. Савецкі перыяд у развіцці беларускага турызму. Інфраструктура турызму БССР. Сучасныя падыходы развіцця турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ 2. АРГАНІЗАЦЫЯ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Тэма 9. Турызм і яго сацыяльна-эканамічныя крытэрыі

Асноўныя паняцці турыстычнай дзейнасці: «турыст», «наведвальнік», «экскурсант», «падарожжа», «тур». Класіфікацыя турызму. Прыкметы турызму. Функцыі турызму: эканамічная, сацыяльная, гуманітарная. Аб’екты і суб’екты турызму. Прафесійны склад турыстычнай арганізацыі. Знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўздзейнічаюць на развіццё турызму.

### Тэма 10. Сучасныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага турызму

Фактары і ўмовы развіцця міжнароднага турызму. Прынцыпы і стратэгіі развіцця міжнароднага турызму. Рэкрэацыйна-рэсурсны патэнцыял Рэспублікі Беларусь і асаблівасці яго засваення. Рэгіянальнае развіццё турызму і фактары яго развіцця. Сучасны ўзровень міжнароднай канкурэнтаздольнасці турыстычнага комплексу Беларусі. Прыярытэтныя напрамкі развіцця ўязнога міжнароднага турызму Беларусі.

### Тэма 11. Тураператарская і турагенцкая дзейнасць

Паняцці «тураператар», «турагент» і «тураператарская дзейнасць» і «турагенцкая дзейнасць». Асноўныя функцыі турыстычных арганізацый і напрамкі іх дзейнасці. Класіфікацыя тураператараў. Спецыфіка тураператарскай і турагенцкай дзейнасці. Буйнейшыя тураператары Беларусі і іншых краін. Дзейнасць айчынных турыстычных кампаній.

## Тэма 12. Тэхналогія распрацоўкі і фарміравання турыстычнага прадукту

Разуменне турыстычнага прадукту як комплексу турыстычных паслуг. Фактары вытворчасці турыстычнага прадукту. Тур, як першасная адзінка турыстычнага продукту. Тур, дадатковыя турысцка-экскурсійныя паслугі і тавары. Фарміраванне асноўнага і дадатковага комплексу паслуг. Этапы распрацоўкі турыстычнага прадукту. Жыццёвы цыкл турпрадукту. Эксперыментальная праверка тура. Тэхналагічная дакументацыя. Дзяржаўнае рэгуляванне якасці турыстычна-экскурсійнага абслугоўвання.

## Тэма 13. Прасоўванне і рэалізацыя турыстычнага прадукту

Даследаванне турыстычнага рынку. Стратэгіі прасоўвання турыстычнага прадукту. Забеспячэнне якасці турыстычнага прадукту. Маркетынгавыя камунікацыі ў рэалізацыі турыстычнага прадукту. Рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі турыстычнага прадукту. Выставачная дзейнасць турыстычных прадпрыемстваў. Стымуляванне збыту, рэкламная дзейнасць і сувязь з грамадскасцю.

## Тэма 14. Паслугі размяшчэння і харчавання ў турызме

Тыпалогія гатэляў. Класіфікацыя гатэляў (па месцазнаходжанні, па забеспячэнні харчаваннем, па ўзроўні коштаў, па ўзроўні камфорту, па прызначэнні). Перавагі гатэльных сетак. Асноўныя і дадатковыя паслугі гатэляў. Формы супрацоўніцтва тураператараў і гатэльных прадпрыемстваў.

Класіфікацыя прадпрыемстваў харчавання. Умовы харчавання ў рэстаранах гатэльных комплексаў. Метады абслугоўвання ў індустрыі харчавання. Кейтэрынг і стрыт-фуд.

## Тэма 15. Транспартныя паслугі ў турызме

Класіфікацыя транспартных сродкаў. Паветраны транспарт у турызме. Формы ўзаемадзеяння турыстычных арганізацый і авіякампаній. Водны

транспарт у турызме. Асаблівасці арганізацыі круізаў. Чыгуначны транспарт у турызме. Турысцка-экскурсійныя цягнікі. Доўга- і кароткатэрміновыя аўтобусныя перавозкі турыстаў. Аўтамабільныя падарожжы ў турызме. Паслуга арэнды аўтамабіля. Камбінiраваныя туры. Забеспячэнне камфорту і бяспекі турыстаў падчас паездкі.

### Тэма 16. Экскурсійная дзейнасць і анімацыя

Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання. Сутнасць, структура і класіфікацыя экскурсій. Сектар анімацыйнай дзейнасці ў турызме. Арганізацыя вольнага часу турыстаў у гатэлях. Забеспячэнне культурна-пазнавальнымі і забаўляльнымі праграмамі. Сусветна вядомыя забаўляльныя цэнтры, атракцыёны, тэматычныя паркі. Забеспячэнне дзіцячага адпачынку.

### Тэма 17. Турыстычныя фармальнасці, страхаванне, бяспека

Сутнасць і віды турыстычных фармальнасцей. Дакументы турыстычных кампаній і працэдура іх афармлення. Дзейнасць міжнародных арганізацый па спрашчэнні турыстычных фармальнасцей. Пашпартна-візавыя фармальнасці. Віды віз. Асаблівасці афармлення віз для наведвання краін Шэнгенскай зоны. Мытныя фармальнасці: сутнасць, асноўныя характарыстыкі. Дэкларацыя тавараў. Санітарныя фармальнасці ў турызме. Бяспека турыстаў як важнейшы прынцып арганізацыі турызму. Класіфікацыя і віды страхавання ў турызме.

### Тэма 18. Арганізацыя і кіраўніцтва турыстычнай кампаніяй

Арганізацыя і кіраванне турыстычным прадпрыемствам. Напрамкі рацыянальнай арганізацыі працы менеджара турфірмы. Укараненне камп’ютарных інфармацыйных тэхналогій. Прафесійныя абавязкі агента, менеджара, кіраўніка турыстычнай кампаніі. Стварэнне спрыяльных умоў працы супрацоўнікаў. Патрабаванні да арганізацыі працоўнага месца супрацоўнікам турыстычнай кампаніі.

## Тэма 19. Культура і этыка абслугоўвання

Этычныя прынцыпы, закладзеныя ў падмурак сферы абслугоўвання. Прафесійная этыка работнікаў турыстычнай індустрыі. Кодэкс прафесійнай этыкі работнікаў сферы абслугоўвання. Прафесійныя паводзіны работніка турыстычнай сферы. Карпаратыўная этыка. Культура зносін і абслугоўвання.

Паняцце камунікатыўнай кампетэнтнасці спецыяліста турыстычнай індустрыі. Асобасныя якасці і неабходныя веды, уменні, навыкі спецыяліста ў галіне турыстычнага бізнесу.

## Тэма 20. Псіхалогія ў сферы абслугоўвання

Прафесійныя і псіхалагічныя аспекты работы ў турыстычнай індустрыі. Асноўныя якасці прафесійнай культуры менеджара турфірмы. Тактыка і тэхналогія абслугоўвання кліентаў. Культура абслугоўвання кліентаў у офісе. Абслугоўванне падчас паездак і экскурсійных праграм. Скаргі і канфлікты пры абслугоўванні кліентаў і шляхі іх вырашэння. Прафесійныя стасункі і правядзенне перамоў з партнёрамі.

## Тэма 21. Прававое рэгуляванне турызму ў Рэспубліцы Беларусь

Турыстычная палітыка: сутнасць і асноўныя функцыі. Сістэма кіравання індустрыяй турызму ў Беларусі. Міжнароднае заканадаўства ў індустрыі турызму. Манільская дэкларацыя па сусветнаму турызму (1980), Хартыя турызму (1985), Гаагская дэкларацыя па турызме (1989), Глабальны этычны кодэкс турызму (1999), Квэбэкская дэкларацыя па экатурызме (2002). Нарматыўна-прававое забеспячэнне рэгулявання турыстычнай дзейнасці. Асноўныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб турызме» (2010). Стандартызацыя і сертыфікацыя ў турызме.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнай вучэбнай дысцыпліне.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, падрыхтоўка прэзентацый і г. д.

### Тэма 1-3. Гісторыя падарожжаў у старажытнасці

1. Перыядызацыя развіцця турызму.
2. Падарожжы ў Старажытным свеце.
3. Першыя падарожжы ў краінах Усходу.
4. Падарожжы ў Старажытнай Грэцыі і Рыме

### Тэма 4-6. Гісторыя падарожжаў ад Сярэднявечча да XIX ст.

1. Паходы і падарожжы ў Сярэднявечча.
2. Крыжовыя паходы, іх значэнне ў турызме.
3. Вялікія геаграфічныя адкрыцці, іх значэнне ў развіцці турызму.
4. Паездкі і падарожжы ў Новы час.
5. Першыя падарожжы на беларускіх землях.
6. Першыя вандроўцы на беларускіх землях, матывы іх падарожжаў.
7. Матывы і геаграфія падарожжаў на беларускіх землях XVII-XIX стст.

### Тэма 7-10. Асноўныя этапы развіцця турызму

1. Узнікненне і развіццё турызму ў XIX ст.
2. Міжнародны турызм як масавая з’ява XX ст.

3. Савецкі турызм і спорт.
4. Развіццё турысцкай індустрыі ў XXI ст.
5. Сучасны турызм на Беларусі.
6. Турыстычны патэнцыял Беларусі.
7. Міжнародныя турысцкія арганізацыі.

### Тэма 11-12. Класіфікацыі, тыпы і катэгорыі турызму

1. Культурна-пазнавальны турызм.
2. Лячэбна-аздараўленчы турызм.
3. Рэлігійны і паломніцкі турызм.
4. Спартыўны і экстрэмальны турызм.
5. Аграэтурызм: паняцце і сутнасць.
6. Спецыфіка дзелавога турызму.

### Тэма 13-16. Асноўныя і дадатковыя паслугі турызму

1. Тур, працэдура яго стварэння і афармлення.
2. Этапы стварэння і рэалізацыі турыстычнага прадукту.
3. Тураператарская і турагенцкая дзейнасць.
4. Інфармацыйныя тэхналогіі ў турызме.
5. Гасцінічная індустрыя. Віды і класіфікацыя гасцініц.
6. Паслугі харчавання ў турызме. Віды харчавання.
7. Сектар забаўлення і прадастаўленне дадатковых паслуг.
8. Транспартнае забеспячэнне ў турызме.

### Тэма 17-18. Турыстычныя фармальнасці, страхаванне, бяспека

1. Мытныя фармальнасці: сутнасць, асноўныя характарыстыкі.
2. Турысцкі ваўчар і працэдура яго афармлення.
3. Пашпартна-візавыя фармальнасці. Віды віз. Шэнгенская віза.
4. Бяспека турыстаў і страхавання ў турызме.

## Тэма 19-20. Псіхалогія і этыка ў сферы абслугоўвання

1. Правілы маўленчага этыкету ў турызме.

2. Дзелавая перапіска ў турызме, вядзенне перамоў і нарад.

3. Прафесійныя і псіхалагічныя аспекты працы з кліентамі ў турыстычнай сферы.

4. Скаргі і канфлікты пры абслугоўванні кліентаў і шляхі іх вырашэння.

5. Асобасныя якасці, веды, уменні і навыкі спецыяліста ў галіне турыстычнага бізнесу.

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў.** Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліку і экзамена.

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў.** Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах курса, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да заліку і экзамена.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і

рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліка і экзамена.

**Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання.** Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; кантэнт-аналіз; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## 4.2 Пытанні да экзамена

1. Сутнасць і змест турызму, асноўныя паняцці і вызначэнні.
2. Знешнія і ўнутраныя фактары развіцця турызму.
3. Класіфікацыі, тыпы і катэгорыі турызму.
4. Культурна-пазнавальны турызм.
5. Лячэбна-аздараўленчы турызм.
6. Рэлігійны і паломніцкі турызм.
7. Спартыўны і экстрэмальны турызм.
8. Аграэтурызм: паняцце і сутнасць.
9. Спецыфіка дзелавога турызму.
10. Перыядызацыя развіцця турызму.

11. Падарожжы ў Старажытным свеце.

12. Першыя падарожжы ў краінах Усходу.

13. Падарожжы ў Старажытнай Грэцыі і Рыме

14. Паходы і падарожжы ў Сярэднявечча.

15. Крыжовыя паходы, іх значэнне ў турызме.

16. Вялікія геаграфічныя адкрыцці, іх значэнне ў развіцці турызму.

17. Паездкі і падарожжы ў Новы час.

18. Першыя вандроўцы на беларускіх землях, матывы іх падарожжаў.

19. Матывы і геаграфія падарожжаў на беларускіх землях XVII-XIX стст.

20. Узнікненне і развіццё турызму ў XIX ст.

21. Міжнародны турызм як масавая з’ява XX ст.

22. Савецкі турызм і спорт.

23. Развіццё турысцкай індустрыі ў XXI ст.

24. Сучасны турызм на Беларусі.

25. Турыстычны патэнцыял Беларусі.

26. Міжнародныя турысцкія арганізацыі.

27. Нарматыўна-прававое рэгуляванне турызму.

28. Тур, працэдура яго стварэння і афармлення. Асноўныя і дадатковыя паслугі.

29. Этапы стварэння і рэалізацыі турыстычнага прадукту.

30. Тураператарская і турагенцкая дзейнасць.

31. Інфармацыйныя тэхналогіі ў турызме.

32. Гасцінічная індустрыя. Віды і класіфікацыя гасцініц.

33. Паслугі харчавання ў турызме. Віды харчавання.

34. Сектар забаўлення і прадастаўленне дадатковых паслуг.

35. Транспартнае забеспячэнне ў турызме.

36. Пашпартна-візавыя фармальнасці. Віды віз. Шэнгенская віза.

37. Мытныя фармальнасці: сутнасць, асноўныя характарыстыкі.

38. Бяспека турыстаў і страхаванне ў турызме.

39. Правілы маўленчага і дзелавога этыкету ў турызме.

40. Асобасныя якасці, веды, уменні і навыкі спецыяліста ў галіне турыстычнага бізнесу.

41. Скаргі і канфлікты пры абслугоўванні кліентаў і шляхі іх вырашэння.

42. Дзелавая перапіска ў турызме, вядзенне перамоў і нарад.

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тэматычны план

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| 1. | Уводзіны | 2 | 2 | | |
| Раздзел 1. Гісторыя падарожжаў і турызму | | | | | |
| 2. | Асноўныя паняцці. Перыядызацыя гісторыі турызму | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 3. | Гісторыя падарожжаў у Старажытным свеце | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 4. | Падарожжы ў эпоху Сярэднявечча | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 5. | Вандраванні у эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 6. | Падарожжы ў XVIII–XIXстст. | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 7. | Турыстычная індустрыя ў XX–XXI стст. | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне |
| 8. | Гісторыя падарожжаў | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне, |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | і развіццё турызму ў Беларусі | | | | тэставае заданне |
| Раздзел 2. Арганізацыя турыстычнай дзейнасці | | | | | |
| 9. | Турызм і яго сацыяльна-эканамічныя крытэрыі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 10. | Сучасныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага і нацыянальнага турызму | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 11. | Тураператарская і турагенцкая дзейнасць | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 12. | Тэхналогія рапрацоўкі і фарміравання турыстычнага прадукту | 6 | 4 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 13. | Прасоўванне і рэалізацыя турыстычнага прадукту | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 14. | Паслугі размяшчэння і | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | харчавання ў турызме | | | | тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 15. | Транспартныя паслугі ў турызме | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 16. | Турыстычныя фармальнасці, страхаванне, бяспека | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 17. | Экскурсійная дзейнасць і анімацыя | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыйныя прэзентацыі |
| 18. | Арганізацыя і кіраўніцтва турыстычнай кампаніяй | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 19. | Культура і этыка абслугоўвання | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| 20. | Псіхалогія ў сферы абслугоўвання | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 21. | Прававое рэгуляванне турызму ў Рэспубліцы Беларусь | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа |
| | **Разам:** | **98** | **58** | **40** | |

## 5.2 Асноўная літаратура


1. Воронкова, Л. П. История туризма и гостеприимства : учебное пособие для студентов, обучающихся по направлениям подготовки специальностям «Туризм» и «Сервис» / Л. П. Воронкова. – Москва : Кнорус, 2021. – 347 с.

2. Гайдукевич, Л. М. Международное сотрудничество по обеспечению безопасности в туризме : учебно-методическое пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности «Международные отношения» / Л. М. Гайдукевич. – Минск : Четыре четверти, 2022. – 102 с.

3. Кабушкин, Н. И. Менеджмент туристической индустрии : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования / Н. И. Кабушкин, О. В. Ежель. – Минск : РИВШ, 2022. – 418 с.

4. Савина, Н. В. Анимационная деятельность и сервис в туристической индустрии : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования / Н. В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2020. – 350 с.

5. Соколова, М. В. История туризма : учебное пособие для студентов вузов / М. В. Соколова. – Москва : Академия, 2012. – 350 с.

6. Чирский, Н. А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности : учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по туристским специальностям / Н. А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

7. Шаповал, Г. Ф. История туризма Беларуси / Г. Ф. Шаповал. – Минск : РИВШ, 2006. – 163 с.

## 5.3 Дадатковая літаратура

1. Березовская, Л. Г. История туризма и гостеприимства / Л. Г. Березовская. – М. : Юрайт, 2014. – 477 с.

2. Грицкевич, В. П. История туризма в древности / В. П. Грицкевич. – СПб : Герда, 2005 – 336 с.

3. Дулов, А. Н. История путешествий и туризма : монография / А. Н. Дулов, К. А. Дюхова, Д. В. Юрчак. – Витебск : УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2011. – 139 с.

4. Дурович, А. П. Организация туризма : учебное пособие / А. П. Дурович. – Минск : РИПО, 2020. – 297 с.

5. Дурович, А.П. Продвижение туристского продукта на рынок. – Минск: БГЭУ, 2008. – 186 с.

6. Квартальнов, В. А. Туризм: учебник / В. А. Квартальнов. – М : Финансы и статистика, 2007. – 336 с.

7. Матюхина, Ю. А. Организация туристской индустрии: учебное пособие / Ю. А. Матюхина. – М. : Альфа-М : ИНФРА-М, 2011. – 304 с.

8. Новиков, В. С. Организация туристской деятельности : учебник для студентов учреждений высшего профессионального образования, обучающихся по направлению «Туризм» / В. С. Новиков. – М. : Академия, 2013. – 333 с.

9. Организация туризма: учебное пособие / А. П. Дурович, Н. И. Кабушкин, Т. М. Сергеева [и др.]; под общ. ред. Н. И. Кабушкина. – Минск : Новое знание, 2003. – 632 с.

10. Соколова, М. В. История туризма : учеб. пособие для студентов учреждений высшего профессионального образования / М. В. Соколова. – 7-е изд., испр. – М. : Издательский центр «Академия», 2012. – 352 с.

11. Хайретдинова, О.А . Технология и организация туроператорской деятельности : учебное пособие / О. А. Хайретдинова. – Уфа : Уфимский государственный университет экономики и сервиса, 2015. – 107 с.